**Урок дадатковага чытання. Уладзіслаў Нядзведскі “Хлопцы з другога корпуса”**

Войткус Вольга Аляксандраўна,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
ДУА “Мікашэвіцкая гімназія імя У.І.Нядзведскага”
E-mail: mgschool@brest.by

Творчасць Уладзіслава Іосіфавіча Нядзведскага ў школьным курсе беларускай літаратуры не вывучаецца, але паколькі вывучэнне творчасці пісьменнікаў-землякоў, гістарычнай спадчыны неабходны элемент выхавання навучэнцаў, то і мы ў Мікашэвіцкай гімназіі імя У.І.Нядзведскага абавязкова разглядаем на ўроках дадатковага чытання творчасць пісьменніка, жыццё якога звязана з нашым горадам.У сценах гімназіі ў 2001 годзе была адкрыта экспазіцыя ,прысвечаная У.Нядзведскаму, а 20 красавіка 2005 года навучальная ўстанова атрымала імя У.І.Нядзведскага.Уладзіслаў Нядзведскі-аўтар каля дзясятка кніг прозы і паэзіі, але, на жаль, з моманту выхаду апошняй прайшло шмат гадоў. Каб зрабіць музей больш значным, гімназія пачала руплівa збіраць успаміны тых, хто ведаў пісьменніка. Праз пэўны час практычна ўсе буйныя пісьменніка перабывалі ў Мікашэвічах.

Пісьменнікі не толькі даносяць да нас беларускае слова, ім дадзена цудоўная магчымасць праз сваю творчасць уплываць на людзей. Кнігі вучаць шанаваць Радзіму, бацькоў, род свой, родную мову, традыцыі. Мастацкія творы памагаюць захаваць у сваёй душы спагаду, добрыя адносіны да людзей, заўсёды быць Чалавекам. Сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі аздабляюцца выставамі літаратуры, прэзентацыямі кніг, гістарычнымі аповедамі, дыспутамі пра каштоўнасці чалавечага жыцця, інсцэніроўкамі твораў. Пісьменнікі старэйшага пакалення далі магчымасць сабраць унікальныя успаміны пра Уладзіслава Нядзведскага. Амаль дваццаць пяць гадоў прайшло з таго трагічнага дня,калі загінуў пісьменнік,таму важна было знайсці тых хто яго добра ведаў.Ніл Гілевіч,Анатоль Вярцінскі,Васіль Зуёнак,Сяргей Законнікаў - калі б не іх аповеды пра Уладзіслава Нядзведскага, ніколі асоба пісьменніка не была б добра прадстаўлена землякам.Уладзімір Ліпскі, Уладзімір Скарынкін, Вольга Іпатава, Андрэй Мазько,Міхась Скобла, Анатоль Зэкаў -гэта не поўны пералік пісьменнікаў, якія наведалі гімназію і выказалі сваю шчырую ўдзячнасць за ўвагу да памяці свайго калегі. “Ён быў дужа добры чалавек і выдатны паэт.Будзьце на ягоным узроўні любові і служэнні роднай нашай Беларусі” (Генадзь Бураўкін). Неаднаразовым госцем гімназіі быў Леанід Васільевіч Дранько-Майсюк, навучэнцы ўспамінаюць і сёння свой унікальны вопыт харавога выканнання вершаў сумесна з паэтам, многія навучэнцы вельмі артыстычна чытаюць вершы, любяць песні на вершы беларускіх паэтаў, бо былі слухачамі спеваў Эдуарда Акуліна і Алеся Камоцкага.

**План урока па беларускай літаратуры ў 6 класе, 2 чвэрць**

**Тэма: Урок дадатковага чытання. У.Нядзведскі. Аповесць “Хлопцы з другога корпуса”**

**Мэты і задачы:**

Увесці вучняў у свет творчай спадчыны пісьменніка-земляка У.І.Нядзведскага; звярнуць увагу на жыццё дзяцей-сірот у няпростыя пасляваенныя часы ў аповесці “Хлопцы з другога корпуса”; пазнаёміць вучняў з асаблівасцямі аповесці, вобразамі ў творы; развіваць уменне вуснага пераказу; выпрацоўваць навыкі аналізу самастойна

прачытаных твораў, развіваць творчыя здольнасці навучэнцаў; выхоўваць увагу да творчасці пісьменніка – земляка

**Абсталяванне:**

прэзентацыя па жыццёвым і творчым шляху У.Нядзведскага; выстава яго кніг; тэставыя заданні па аповесці; выстава творчых работ вучняў (даецца папераджальнае заданне).

**Апераджальнае заданне:**

Падрыхтаваць паведамленне на тэму "Жыццёвы і творчы шлях У.І.Нядзведскага"

**Эпіграф:**

У доме дзіцячым я кожнай сцяне
Складаць абавязан паэму.
У.І.Нядзведскі (Верш "Дома" )

Ход урока:

**1.Арганізацыйны момант**

**2.Уступнае слова настаўніка**

Добры дзень. Я радая вітаць вас на ўроку , які, спадзяюся, накіруе нас з вамі ў новыя нязведаныя крыніцы літаратурнай творчасці, да пазнання новага.У добры шлях, мае падарожнікі.

**3.Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

**4.Вывучэнне новай тэмы**

Сёння ў нас незвычайная сустрэча.Сустрэча з тым чалавекам, пісьменнікам, творцам, імя якога носіць наша гімназія. З Уладзіславам Іосіфавічам Нядзведскім і яго творчасцю.

- Чаму нашай гімназіі прысвоена імя менавіта гэтага пісьменніка?
  *(Будучы пісьменнік жыў і выхоўваўся ў Мікашэвіцкім дзіцячым доме, які існаваў раней у нашым горадзе)*

А зараз мы паслухаем выступленне раней падрыхтаваных вучняў пра жыццёвы і творчы шлях У.І.Нядзведскага.

Слайд 1.





Слайд 2.

Вядучы 1. НарадзіўсяУ.І.Нядзведскі 24 ліпеня 1929г. на адным з Рахавіцкіх хутароў Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці (сёння – Салігорскі р-н). Закончыў 2 класы па –польску з выкладаннем каталіцкай і праваслаўнай рэлігій.У верасні 1939 г. – пайшоў у 3 клас,дзе вучылі па-беларуску і па-руску.У 1941годзе закончыў школу.




Слайд 3.

Вядучы 2. У лютым 1943г. пачалася блакада Ленінскага раёна, аблава; 16 лютага 1943 –забілі бацькоў, брата з сястрой.




Слайд 4.

Вядучы 1. Уладзіславу  з сястрой Віняй удалося выратавацца.




Слайд 5.

Вядучы 2.  У лістападзе 1945 года райкам камсамола накіраваў У. І. Нядзведскага выхоўваца ў Мікашэвіцкі дзіцячы дом. З 1948года па 1950 ён працаваў там старшым піянерважатым.

Слайд 7. 


Вядучы 1. У 1947 годзе 31 студзеня ў будучага пісьменніка адбылася незабыўная сустрэча з Я.Коласам.

У 1950 годзе У.Нядзведскі скончыў сярэднюю школу, нейкі час працаваў сакратаром у газеце «Камуніст» — органе палітаддзела МТС.

У 1950-55 гадах вучыўся ў Мінску на філфаку БДУ, у 1952 годзе надрукаваў першы верш у рэспубліканскім друку.

Заняткі літаратурнага гуртка студэнтаў праводзілі Пятрусь Глебка і Кандрат Крапіва.

Слайд 8. 


Вядучы 2. Пасля заканчэння ўніверсітэта тры гады працаваў настаўнікам Гайнаўскай СШ на Лагойшчыне, дзе ў 1958 годзе выдаў першы зборнік вершаў, стаў сябрам Саюза пісьменнікаў. Потым была праца на Беларускім тэлебачанні, у часопісе «Маладосць».

Слайд 9. 

Вядучы 1. Уладзіслаў Іосіфавіч - аўтар кніг вершаў і прозы «Вясновыя барозны», «Запрашэнне», «Сто братоў і сясцёр», «У лясной старане», «Капронавыя галёшы», «Начная пагоня», «Размова з адсутнымі», «Хлопцы з другога корпуса», «Вузлы», «Выбранае».

Слайд 10. 


Вядучы 2. Трагічна загінуў пісьменнік 17 кастрычніка 1973г.

**5.Праца над зместам аповесці**

Праводзіцца па пытаннях:

- Дзе адбываецца дзеянне аповесці? *(Дзеянне адбываецца ў мястэчку Кірмашэвічы.)*
- Назавіце герояў твора, што маюць прататыпаў. *(Віця – Уладзіслаў Нядзведскі; Арсень Зайцаў –Аркадзь Паўлавіч Чаша(былы дырэктар сярэдняй школы № 1);нач. міліцыі Гразоўскі – Гразноўскі; дырэктар дзіцячага дома –Мікалай Пятровіч Цыганкоў.)*
- Як траплялі дзеці ў дзіцячы дом? *(Дзеці, бацькі якіх загінулі ў час вайны, пасылаліся ў дзіцячыя дамы на выхаванне, часта іх вылоўлівала міліцыя.Сіроты часта жылі на чыгуначных вакзалах, на рынках.)*
- Як складваліся іх узаемаадносіны*?(Узаемаадносіны былі розныя: некаторыя дзеці сварыліся, даходзіла да сварак, але і існавала ўзаемадапамога, заступніцтва за дзетдомаўскіх, клопат пра іншых.)*
- Якія рысы характару можна заўважыць у дзетдомаўцаў? *(Схільнасць да падману, самастойнасць у дзеяннях і ўчынках, незалежнасць,але ў той жа час і дабрыня, узаемавыручка, спагада.)*
- Хто і як паўплываў на дзяцей? *(Паўплываў на развіццё характараў выхаванцаў дырэктар дзетдома Мікалай Пятровіч Цыганкоў, які сваім прыкладам, цярплівасцю і дыфірынцыраваным падыходам да кожнага імкнуўся зрабіць з сірот людзей з вялікай літары; а таксама самі выхаванцы вучыліся жыць разам, змагацца з нястачамі, перамагаць у агульнай справе.)*
- Да якіх роздумаў падводзіць нас аўтар у канцы твора? *( Для таго, каб стаць сапраўдным чалавекам, карысным грамадству, людзям, трэба да гэтага імкнуцца і абавязкова ўсё атрымаецца.Галоўнае ў жыцці - не здавацца.)*

**Фізкультхвілінка**

- Прадстаўленне творчых работ вучняў (крыжаванкі, ілюстрацыі, віктарыны)

**5.Падагульненне**

- Тэст па аповесці

**6.Рэфлексія**

- Якая сувязь паміж творчасцю Нядзведскага і нашым горадам Мікашэвічы?
- Як можна ўвекавечыць імя пісьменніка і ці трэба гэта рабіць?

- Прадоўжыце сказ: гэты ўрок прымусіў мяне задумацца над…

**7.Заданне на дом.**

Падрыхтаваць вуснае выступленне на тэму “Пісьменнік - зямляк” і выразнае чытанне аднаго з вершаў У.І.Нядзведскага.

**8.Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак**

**Тэставая работа па аповесці У.І.Нядзведскага “Хлопцы з другога корпуса”**

**1.Імя галоўнага героя аповесці “ Хлопцы з другога корпуса”:**
А)Дзіма Гарох ;
**Б)Віця Ляўковіч;**
В)Апанас Кныш.
**2.Дзе адбываюцца падзеі, апісаныя ў аповесці?**
**А)Кірмашэвічы;**
Б)Харамец;
В)Мінск.
**3.Пасля прыезду ў Кірмашэвічы Віця спачатку жыў:**
А)з бацькамі;
Б)у дзіцячым доме;
**В)з далёкімі родзічамі.**
**4.Куды пайшоў Віця пасля таго, як гаспадыня яго выгнала?**
**А)на чыгуначны вакзал;**
Б)у вёску;
В)у лес.
**5.Прозвішча начальніка міліцыі ў Кірмашэвічах:**
А)Іваноў;
**Б)Гразоўскі;**
В)Гукун.
**6.Як звалі дырэктара дзіцячага дома ў Кірмашэвічах?**
А)Пётр Аляксандравіч;
**Б)Мікалай Пятровіч;**
В)Раман Мікалаевіч.
**7.Імя хлопчыка, які першым сустрэў Віцю і паказаў яму дзіцячы дом:**
**А)Барыс Цыган;**
Б)Максім Зялёнка;
В)Міша Лебедзь.
**8.У які клас залічылі Віцю Ляўковіча?**
А)у пяты;
**Б)у шосты;**
В)у сёмы.
**9.Аб чым дамаўляліся хлопцы за лазняй?**
А) аб падтрымцы;
**Б) аб тым , што трэба ўцячы з дзіцячага дома;**
В) аб тым , як пакараць гарадскіх хлопцаў.
**10.Пад другі корпус дзіцячага дома аддалі:**
А)будынак школы;
**Б)будынак старой гасцініцы;**
В)стары склад.
**11.Што павінен быў зрабіць Віця Ляўковіч , каб даказаць хлопцам, што Гразоўскі не прыходзіў іх арыштоўваць?**
А)даць слова;
**Б)есці зямлю;**

В)яны паверылі без праверкі.
**12.Хто ажыццяўляў рамонт будынка старой гасцініцы?**
**А)выхаванцы дзіцячага дома;**
Б)будаўнічая брыгада;
В)жыхары Кірмашэвіч.
**13.Што зрабіў Віця , калі ўбачыў палонных немцаў?**
А)уцёк;
**Б)кінуў у іх каменем;**
В)стаяў і моўчкі глядзеў.
**14.Хто з выхаванцаў дзіцячага дома здзейсніў уцёкі?**
А)Віця Ляўковіч;
**Б)Апанас Кныш;**
В)Барыс Цыган.
**15.Адзін з самых малодшых выхаавнцаў дзіцячага дома, сябар Барыса:**
А) Адам;
**Б) Ілік;**
В) Віця.
**16.Якому рамяству вучыў выхаванцаў дзіцячага дома стары Шлёма?**
А) шыць вопратку;
**Б) шыць абутак;**
В) рабіць крэслы.
**17.Як называўся орган самакіравання , створаны ў дзіцячым доме?**
**А)дзіцячы савет;**
Б) камсамольская брыгада;
В)піянерская дружына.
**18.Што купілі выхаванцы дзіцячага дома з надыходам зімы?**
А) шапкі - вушанкі;
**Б) лыжы і канькі;**
В) цёплы абутак.
**19.Што прыслаў Апанас Кныш дырэктару дзіцячага дома?**
А)падарунак;
Б)прывітанне;
**В)грошы**.
**20.Як пакаралі  Арсеня Зайцава за бойку на катку?**
**А)вывелі з дзіцячага савета;**
Б)фізічна пакаралі;
В)забаранілі гуляць на вуліцы.
**21.Дзе Апанас Кныш сустрэў сяброў з дзіцячага дома і вырашыў вярнуцца ?**
**А) на чыгуначным вакзале ў Пінску;**
Б) у лесе каля Кірмашэвіч;
В) на рэчцы ля вёскі.
**22.Што вырашылі зрабіць на пустыры ля дзіцячага дома?**
А)футбольнае поле;
**Б)пасадзіць сад;**
В)пабудаваць лазню.
**23.Як загінуў начальнік міліцыі Гразоўскі?**
**А)у сутычцы з бандытамі;**
Б)у аўтамабільнай аварыі;
В) у час пажару.
**24.Куды накіравалі шэсць лепшых выхаванцаў на вучобу?**

А)у Мінск у БДУ;
**Б) у Ленінград у рамеснае вучылішча;**
В)у Маскву ў новы дзіцячы дом.
**Адказы:**
**1 б; 2 а; 3 в; 4 а; 5 б; 6 б; 7 а; 8 б; 9 б; 10 б; 11 б; 12 а; 13 б; 14 б; 15 б; 16 б; 17 а; 18 б; 19 в; 20 а;**
**21 а; 22 б; 23 а; 24 б.**